Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Грыцкавіцкі навучальна-педагагічны комплекс
дзіцячы сад – сярэдняя школа»

# ДЗЕНЬ ПЕРАМОГІ
(гульня - віктарына)

Сяргей Алена Вячаславаўна
сярэдняя спецыяльная адукацыя
1 кваліфікацыйная катэгорыя

аг. Грыцкевічы, 2022

Задачы: падтрымліваць пазнавальную цікавасць да гісторыі сваёй краіны; прывіваць любоў да Радзімы, гонар за яе; актыўна падтрымліваць ініцыятыву адказаў на пытанні віктарыны;

Ход гульні – віктарыны:

Выхаванік: Сёння мы правядзём гульню – віктарыну "Дзень Перамогі", прысвечаную перамозе ў Вялікай Айчыннай вайне. За кожны правільны адказ каманды атрымліваюць фішкі, у канцы гульні па іх колькасці мы вызначым пераможцаў.

Выхавальнік размяркоўвае дзяцей на 2 каманды і прапануе кожнай камандзе прыдумаць назву ("Пагранічнікі", "Маракі")

Заданне1. "Размінка" – "Хто больш назаве родаў войск".

Каманды па чарзе называюць роды войск. Перамагае каманда, якая апошняй сказала назву рода войск.

Выхавальнік: Скажыце, у каго ёсць дзядулі і бабулі, якія ваявалі на вайне, кім яны ваявалі і як? (Салдатамі, медсёстрамі і г.д.) Давайце ўспомнім з вамі ваенныя прафесіі.

Заданне 2. "Ваенныя прафесіі"

Выхавальнік прапануе дзецям расказаць, хто з іх родных і блізкіх быў на вайне, як яны ваявалі. Затым камандам прапануецца па чарзе назваць ваенныя прафесіі. Перамагае тая каманда, якая апошняй назаве ваенную прафесію. (*танкіст, лётчык, артылерыст, разведчык, дэсантнік.)*

Заданне 3. «Вылажы з палачак»

Каманды выкладваюць з палачак танк, карабель.

Заданне 4. "Каму што патрэбна?"

Каманды атрымліваюць па дзве карткі з ваеннымі прафесіямі і карткі з выявай ваеннай тэхнікі, амуніцыі і адзення. Дзеці павінны выбраць карткі, на якіх намаляваны тыя прадметы, якія патрабуюцца для той ці іншай ваеннай прафесіі.

Выхавальнік: Нашы абаронцы Айчыны, якія яны? (мужныя, адважныя, смелыя, бясстрашныя).

Заданне 5. "Смелыя маракі і пагранічнікі".

Пагранічнікі павінны правезці на стужачцы танк паміж перашкодамі з кубікаў так, каб не дапусціць аварыі. Маракі павінны правесці карабель паміж мінамі (кубікамі), каб не падарваць карабель.

Выхавальнік: Дзеці, а вы ведаеце, хто ў войску самы галоўны? (Камандзір). Ад умелых дзеянняў камандзіра залежыць зыход бою, жыццё салдат. У нас з вамі таксама ёсць камандзіры - гэта нашы капітаны.

Заданне 6. "Конкурс капітанаў"

Капітан каманды "Пагранічнікі"

- Колькі гадоў доўжылася Вялікая Айчынная вайна? (4 гады.)
- Якая крэпасць прыняла на сябе першы ўдар вайны? (Брэсцкая крэпасць.)
- Які мемарыяльны комплекс недалёка ад Мінска быў узведзены ў памяць пра вёску, цалкам спаленую фашыстамі? ("Хатынь".)

Капітан каманды "Маракі"

- Якім жаночым імем назвалі вядомую зброю ваенных гадоў? (Кацюша.)
- Якія віды войск удзельнічалі ў Вялікай Айчыннай вайне? (пяхота, авіяцыя, флот.)
- Як называюць людзей, якія ваявалі з захопнікамі ў тыле ворага? (Партызаны.)

Заданне 7. “Закончы прыказку”

Выхавальнік пачынае прыказку пра вайну, каманды па чарзе заканчваюць прыказку, тлумачаць яе значэнне.

У канцы віктарыны падлічваецца, у якой каманды больш фішак, і вызначаецца каманда – пераможца.